ДА 80-Й ГАДАВІНЫ ПАЧАТКУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

# ПАМЯЦЬ. СМУТАК. ПАШАНА



**21 чэрвеня 2021 года ў Гродне прайшла чарговая грамадска-літаратурная акцыя з цыкла «Пад мірным небам Беларусі». Традыцыйнае тэматычнае мерапрыемства Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі было прысвечана 80-й гадавіне пачатку Вялікай Айчыннай вайны.**

У гэтыя спякотныя чэрвеньскія дні Беларусь успамінае ахвяр і герояў самай кровапралітнай за ўсю гісторыю чалавецтва вайны, якая забрала каля 27 міліёнаў жыццяў. Беларусы – адна з найбольш пацярпелых у выніку вайны нацый. Наша рэспубліка страціла больш за палову свайго нацыянальнага багацця. Было разбурана і спалена 209 гарадоў і раённых цэнтраў, 9200 вёсак. Кожны трэці жыхар Беларусі загінуў ад рук фашысцкіх захопнікаў. Такой высокай была цана нашага народа за мір і незалежнасць. Але нягледзячы ні на што наш народ адказаў замежнаму агрэсару гераічным адпорам. Не шкадуючы сваіх жыццяў, нашы мужныя землякі праявілі бясстрашнасць і гераізм у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на франтах Вялікай Айчыннай, вызваліўшы ад карычневай чумы ўсю Еўропу, у адзіным страі з прадстаўнікамі іншых брацкіх народаў дайшлі да самага Берліна. Супраціўленне падпольшчыкаў і партызан Беларусі сталі для ўсіх прыкладам гераізму і паслужылі сюжэтамі для многіх твораў мастацтва.

Напярэдадні 80-годдзя пачатку вайны, Дня усенароднай памяці і смутку літаратары з Гродна і Гродзенскай вобласці сабраліся ў святым месцы – на Кургане Славы ў горадзе над Нёманам, каб пакланіцца загінуўшым воінам-вызваліцелям, у пранікнёных словах прамоў, у радках сваіх твораў выказаць падзяку за мірнае неба над нашай Радзімай. Нягледзячы на 30-градусную спякоту ўдзел у грамадска-літаратурнай акцыі прынялі прадстаўнікі розных пакаленняў – дзеці вайны, ветэраны працы і

літаратурнага руху, дзеці і ўнукі ветэранаў вайны, якая невыпадкова атрымала назву Вялікай Айчыннай. Наша Айчына праявіла сваю веліч менавіта ў гераічным супрацьстаянні вераломнаму агрэсару. Патрыятызм, інтэрнацыянальнае сяброўскае адзінства ў смяротным баі, грамадзянскі дух, воля да свабоды і мірнага жыцця 80 гадоў таму дасягнулі небывалых маштабаў. Усё гэта стала вырашальнымі фактарамі на доўгім і цяжкім шляху да Перамогі.

Як жа сёння ідуць справы з грамадскай еднасцю і народным духам, усе мы не без горычы бачым на красамоўных прыкладах з палітычнага жыцця. Калі ў некаторых прадстаўнікоў беларускага грамадства па ўказцы з-за мяжы яшчэ хапіла смеласці натоўпам рынуцца на абарону сваіх буржуазных амбіцый ды шкурных інтарэсаў, то на інтэрнацыянальную згуртаванасць, на адпор замежнаму агрэсару сёння гатовыя відавочна не ўсе аматары баварскага піва. У розных краінах узнімае галаву міжнародны ліберальны фашызм. Сёння нам, нашчадкам герояў-пераможцаў навязваюць чужыя каштоўнасці; нас настойліва спрабуюць настроіць супраць сваёй уласнай гісторыі, супраць свайго ўласнага сумлення. Палітыка па прынцыпе «падзяляй і ўладар» («разделяй и властвуй») замахнулася і працягвае рабіць замахі на цэласнасць славянскага свету. Кожны з нас абавязаны памятаць пра тое, што 22 чэрвеня 1941 года пад фашысцкімі сцягамі зьнішчаць нас, спальваць нашы вёскі, разбураць нашы гарады прыйшла амаль уся Еўропа. За вельмі невялікім выключэннем. Так, і нават сярод суайчыннікаў было нямала здраднікаў, фашысцкіх прыслужнікаў, калабарацыяністаў і іншых гадаў, нашчадкі, прыхільнікі якіх, на жаль, і сёння імкнуцца вырашаць лёс беларускага народу. Пра гэта таксама ішла гаворка ў выступленнях удзельнікаў акцыі. Насуперак заявам некаторых заходніх палітыкаў аб адсутнасці грамадзянскай свядомасці ў беларусаў нашчадкі пераможцаў фашызму сказалі сваё слова.




Пасля ўскладання кветак у грамадска-літаратурнай акцыі «Пад мірным небам Беларусі» ля мемарыялу «Воінам-землякам, якія загінулі або зніклі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны» выступілі ветэраны працы, ганаровыя члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, празаік Ірына Фамянкова, паэты Віктар Кудлачоў і Браніслаў Ермашкевіч; члены СПБ, паэты Анатоль Апанасевіч, Дзмітрый Радзівончык, Андрэй Татур. Таксама да акцыі далучыліся: ветэран педагагічнай працы, дзіця вайны, член Гродзенскага гарадскога

літаб'яднання «Надзея», паэтэса Наталля Чакліна-Гарбачова; члены СПБ: публіцыст Уладзімір Ягорычаў, празаік Ліна Багданава, дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая, госць з Ваўкавыскага раёну, беларускі паэт Мікалай Іваноўскі, гродзенскія паэтэсы Антаніна Нурэтдзінава і Кацярына Ігнацюк. Узначаліла дэлегацыю старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомая беларуская паэтэса Людміла Антонаўна Кебіч. Прагучалі словы аб неабходнасці абараніць мірнае неба над Беларуссю, не дапусціць абуджэння фашысцкай гадзіны, захаваць памяць аб гераічным подзвігу савецкага салдата, воіна-вызваліцеля, патрыёта-інтэрнацыяналіста.



Выступае Наталля Чакліна-Гарбачова



Браніслаў Ермашкевіч



Андрэй Татур





**Ганна Скаржынская-Савіцкая** **Анатоль Апанасевіч**





**Выступаюць празаік Ірына Васільеўна Фамянкова і дзіцячы паэт Віктар Сямёнавіч Кудлачоў**

Асноўнымі матывамі мастацкіх твораў і прамоў, што прагучалі ў ходзе грамадска-літаратурнай акцыі «Пад мірным небам Беларусі», сталі воля народа да мірнага жыцця, народнае адзінства, смутак, памяць, пашана загінуўшым героям. Галоўны тэзіс: пакуль жыве памяць пра трагічныя старонкі гісторыі, існуюць пераемнасць пакаленняў, чалавечнасць, уласцівая беларусам народная мудрасць, узаемаразуменне і спагада ў шматнацыянальным, шматканфесійным беларускім грамадстве, нам па сілах вытрымаць любыя выклікі часу, любыя выпрабаванні. У шчырых,

вельмі эмацыянальных выступленнях многіх літаратараў прагучалі асабістыя, сямейныя гісторыі, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной. Аб'ядноўвала ўдзельнікаў акцыі ўсведамленне кожным сваёй важкай ролі ў справе абароны ад знявагі нашай гісторыі, ад бездухоўнасці – дня сёняшняга і будучыні краіны. А неба над намі ў гэты дзень было па-летняму светлым і чыстым. Нездарма…

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** моманты і ўдзельнікі прысвечанай 80-й гадавіне пачатку Вялікай Айчыннай вайны грамадска-літаратурнай акцыі з цыкла «Пад мірным небам Беларусі». 21 чэрвеня 2021 года. Гродна, Курган Славы.



**Празаік Ліна Багданава**



**Публіцыст Уладзімір Ягорычаў**







**Мікалай Іваноўскі** **Антаніна Нурэтдзінава**





**Кацярына Ігнацюк** **Выступае старшыня ГрАА СПБ Л.А.Кебіч**








**Паэт Дзмітрый Радзівончык прачытаў некалькі вершаў Пятра Сямінскага**


ЖИЗНЬЮ СВОЕЮ РАВНЕНЬЕ НА ПАВШИХ ГЕРОЕВ ДЕРЖИ

